ДЗЯЎЧЫНА З РАГАЧОВА, ЯКАЯ ЗРАБІЛА САЙТ ПРА МІНСК



Марыля Шлык — асоба надта цікавая. Глядзіце самі: дзяўчына з чароўнай усмешкай, якая піша вершы, дасканала ведае французскую мову і працуе ў сферы дабрачыннасці. Да таго ж, гэта шчырая патрыётка і нястомны генератар творчых ідэй, здольная заразіць уласным энтузіязмам каго заўгодна. Шчасце, што ідэі Марылі рэалізуюцца: у сусветнай павуціне нядаўна з'явіўся плён яе крэатыўнасці — партал place.by, на якім у арыгінальнай форме прадстаўлены найцікавейшыя месцы нашай сталіцы. Карысная штука, улічваючы, што далёка не кожны мінчук можа пахваліцца грунтоўнымі ведамі пра родны горад і зацікавіць ім, напрыклад, гасцей з-за мяжы. Цікава, што родам Марыля з Рагачова. Пагутарым з гэтай таленавітай дачкой Гомельшчыны пра яе дзейнасць на карысць Мінска.

— Раскажы, як з'явілася ідэя стварэння парталу place.by.

— Я даўно цікавілася, хоць і неглыбока, некаторымі фактамі пра Мінск, чытала ў інтэрнэце гісторыі і легенды пра яго. Аднойчы ў цэнтральнай кнігарні набыла кнігу, дзе сцісла распавядаюцца розныя цікавосткі пра Мінск, і прачытала яе на адным дыханні. Даведалася шмат новага пра месцы, міма якіх кожны дзень хаджу: напрыклад, звон каля Чырвонага касцёла, аказваецца, адліты ў Японіі ў памяць аб ядзерных катастрофах, а ў скверыку каля галоўнага корпусу БДУ сабраны скульптуры нашых знакамітых культурных дзеячоў. Вядома, Мінск — гэта не Барселона і не Рым, але ў ім ёсць месцы, якія трэба любіць. Калі распавесці гісторыю месца, то нават будучы простым, яно можа стаць нечым незвычайным для наведвальнікаў. Я гэтую кніжку разрэкламавала сваім сябрам, і ўсім яна спадабалася. Я тады зразумела: мінчукам цікава чытаць пра свой горад, але матэрыял трэба падаваць у простай форме. Так у мяне з'явілася ідэя зрабіць сайт пра Мінск, дзе інфармацыя будзе выкладзеная менавіта такім чынам.

— І якім жа чынам place.by падае звесткі пра Мінск?

— Калі я вандравала ў Львоў, то дзесьці пабачыла наступную рэч: топ-10 лепшых месцаў горада ў розных катэгорыях: «рамантычнае», «кавярні», «храмы»... Такі прынцып лёг у аснову нашага праекта, толькі я ўзяла не топ-10, а топ-5. Я пыталася ў сяброў і ў сяброў сяброў пра тое, якія месцы ў Мінску ім падабаюцца, і прасіла напісаць пра іх тэксты. Даволі шмат людзей адгукнулася. Я склала папярэднія спісы аб'ектаў для кожнай катэгорыі, але заўсёды давала права выбару: «Калі ў спісе няма вашага ўлюбёнага месца, то пазначайце і апісвайце яго». У працэсе я сама даведалася шмат цікавага: напрыклад, калі рабіла катэгорыю «месцы з фаст-фудам», асабліва карысную для замежнікаў, якія шукаюць, дзе хутка паесці. Я ніколі не задумвалася пра тое, што чабурэкі — гэта, як сказаў адзін хлопец, помнік савецкаму фаст-фуду. У нас на Валадарскага ёсць чабурэчная, у якой з 1980-х—1990-х гадоў не змяняецца атмасфера. Гэтае месца любяць карэнныя мінчукі і замежнікі. Адна дзяўчынка пажадала напісаць у катэгорыю «паркі» пра Сэндайскі сквер, аб якім я дагэтуль не чула. Гэты скверык быў пабудава-



ны ў гонар беларуска-японскіх адносін. Там цвіце сакура, ёсць некалькі камянёў і статуй з Японіі. Сэндайскі скверык зусім невялічкі, але, калі прывесці туды замежніка, ён зацікавіцца. Бо, здавалася б, што Беларусь злучае з Японіяй? А вось, калі ласка, цэлы скверык ёсць! Калі з французамі гуляла па сталіцы, іх захапляла тое, што Мінск — горад кантрастаў. Паказвала ім помнік Феліксу Дзяржынскаму і пры гэтым узгадвала, што зусім непадалёк знаходзіцца помнік заснавальніку Чырвонага Крыжа, французу Анры Дзюнону, першаму лаўрэату Нобелеўскай прэміі міру. Французы шчыра дзівіліся наяўнасці ў нас гэтага помніка. Палякі ў сваю чаргу былі ўражаныя помнікам Яну Паўлу ІІ. Такім чынам, мы склалі топ-5 у шматлікіх катэгорыях: паркі, кавярні, рамантычныя месцы, стары Мінск, новы Мінск, клубы і гэтак далей. Працаваць было цяжка, бо праект ствараўся на чыстым энтузіязме. Складана было збіраць і апрацоўваць матэрыял. Для сайта пісалі розныя людзі з рознымі характарамі, таму падыход неаднабаковы. Без дапамогі я б не справілася. Вельмі хочацца падзякаваць праекту «МаеСэнс», які падтрымаў маю задуму, Машы Чараковай, якая нарадзілася ў Беларусі, а пасля з'ехала з сям'ёй у Галандыю і вярнулася дадому працаваць па праграме ААН. Маша дапамагала мне з ідэямі: яна верыла і верыць, што ў Беларусі можна рабіць шмат цікавага. Таксама дзякуй фатографам, асабліва майму сябру Сяргею Ільіну, які зрабіў амаль усе фатаздымкі; дзякуй шматлікім перакладчыкам на беларускую: іх знайшлася цэлая «банда» дзякуючы Насці Кухарэнка, арганізатару СЭТ — Студэнцкага этнаграфічнага таварыства; дзякуй сябрам і сябрам сяброў, якія перакладалі на англійскую. Як бачыце, гэта быў народны праект пад маім кіраўніцтвам. У перспектыве ў нас ёсць ідэя зрабіць паштоўкі з выявамі Мінска, а таксама мапу лепшых месцаў сталіцы.

— Ці папулярны сайт? Ці часта ты чуеш водгукі пра яго і якія гэта водгукі?

— Мы «запусціліся» ў канцы траўня — пачатку чэрвеня. На мой погляд, пакуль недастаткова рэкламы, трэба актыўней прасоўваць праект у інтэрнэце. Я ведаю, што пра запуск сайта напісалі некаторыя выданні, што людзі наведваюць яго. Замежнікі мне пішуць пра тое, што раяць яго сваім сябрам. Беларусы таксама цікавяцца і задаюць пытанні. Справа ідзе, але з цягам часу, я спадзяюся, яна будзе яшчэ больш разварочвацца. Замежнікам трэба паказаць, што Мінск — гэта частка Еўропы, якая можа пахваліцца не толькі спадчынай савецкага мінулага, што ў нас ёсць і прыгожыя храмы, і цікавыя легенды. Большасць з гасцей, трапляючы сюды ўпершыню, са здзіўленнем усклікаюць: «О! А ў вас тут як у Еўропе! Не такая ўжо і адсталая краіна!» А мне хацелася б, каб яны яшчэ там, у сябе дома, ведалі, што мы — не адсталая краіна. Я ўдзельнічаю ў праекце каўч-сёрфінг і цяпер заўсёды даю замежнікам спасылку на place.by. Многія бяруць наш топ-5 за аснову маршруту сваёй экскурсіі. Я бачу, такім чынам, што гэта была недарэмная праца.

— Што ты можаш вылучыць з таго, пра што даведалася падчас працы над праектам?

— Адзін хлопец, удзельнік праекта «МаеСэнс», пажадаў напісаць пра так званы чырвоны дворык, што знаходзіцца на вуліцы Рэвалюцыйнай. Шмат хто бачыў браму, якая вядзе у гэты дворык, але мала хто заходзіў унутр. Хлопец той апісаў чырвоны дворык проста шэдэўральна: бачна, што гэта сапраўды ягонае любімае месца. Адной з умоў, дарэчы, было пісаць толькі пра любімае. Месца ж гэтае вельмі атмасфернае і рамантычнае: туды можна прыйсці з дзяўчынай на першы пацалунак, улетку там праходзяць паказы фільмаў і ладзяцца выставы карцін маладых мастакоў, прэзентуюцца зборнікі вершаў… У такім невялічкім месцы, аказваецца, столькі ўсяго адбываецца. Калі да

мяне прыязджалі французы, я вырашыла іх туды звадзіць. Зразумела, у Францыі такіх мілых маленькіх дворыкаў безліч, але я ім столькі распавяла, што яны былі ўражаныя раней, чым мы зайшлі туды. У гэтым дворыку можна пабачыць графіці, што для Мінска не вельмі характэрна. Французам у выніку вельмі спадабалася.

Адна дзяўчынка напісала для сайта пра маленькую Эйфелеву вежу, што знаходзіцца ў адным з мінскіх двароў. Першапачаткова яна была зроблена як падстаўка для кветак. Потым заўважылі, што на яе сталі часта прыходзіць паглядзець. Тады кветкі знялі, засталася толькі сама вежа. Неаднаразова ў сецівe я бачыла фотаздымкі людзей з беларускай Эйфелевай вежай на далоні. Яшчэ адно цікавае месца, якое варта наведаць, — забудова ў Кунцаўшчыне ў стылі кіслотнага ракако. Аналагаў у Беларусі больш няма. Існуе легенда, што ў Беларусь патаемна прыязджала аўтарка Гары Потэра і наведвала гэтае месца. На адным з дамоў ёсць вывеска «Хогвартс», у доме змяшчаецца дзіцячы адукацыйны цэнтр. То бок, у нас ёсць свой «Хогвартс» — замежнікам гэта таксама цікава і яны з задавальненнем фоткаюць шыльду.

— Пагаворым пра твае стасункі з Мінскам. Адкуль у цябе такая любоў да яго? Бо сама ты родам з Рагачова…

— Я шмат вандравала, у асноўным па Заходняй Еўропе. Аднойчы сябры ў мяне спыталі: «Які горад у цябе самы любімы?» Я адказала: «Рагачоў, канешне!» І ніколі не буду думаць інакш, дзе б ні жыла. Канешне, ён не такі, якім я яго памятаю з дзяцінства. Але гэта мая радзіма і радзіма маіх славутых землякоў. Я заўсёды прыгадваю, што «Каласы пад сярпом тваім» пісаліся ў Рагачове. Я вельмі яго люблю і ніколі ад яго не адмоўлюся. Сем год я пражыла ў Мінску, у асноўным яны прыпалі на вучобу ва ўніверсітэце. Але Мінскам стала асабліва цікавіцца, калі пачала працаваць. Мінск для мяне таксама стаў родным. Гэта твар краіны. Дзякуючы каўч-сёрфінгу я калісьці адкрыла для сябе альтэрнатыўныя экскурсіі. Напрыклад, у Кракаве безліч цікавага, што можна паглядзець, але там ёсць і нефармальныя экскурсіі, якія даюць магчымасць разглядаць не толькі гістарычныя забудовы ці помнікі, а і нешта такое, што вокам адразу



не пабачыш. Я падумала: «У нашым Мінску таксама нешта ёсць!» Лічу абавязкам кожнага дзяліцца часткай сваёй краіны з іншымі.

— Ці не хацела б ты стварыць падобны праект пра Рагачоў?

— Так, пра Рагачоў ёсць што распавесці. Караткевіч, мастак Анатоль Каплан, які стаў знакамітым на ўвесь свет, згушчонка (*смяецца*)… Я б хацела пачаць з простага — рабіць паштоўкі з краявідамі старога Рагачова. Ён старэйшы за Маскву — быў заснаваны ў 1142 г., уваходзіў у ВКЛ. У нас быў нават тэатр, дзе выступаў Шаляпін. Але ў кніжках пра Рагачоў звычайна на адной ці дзвюх старонках змяшчаюцца факты з дарэвалючыйнай гісторыі, а асноўную частку займае савецкі час. Я пайшла да гісторыкаў пытацца, дзе шукаць страчаны час. Аказалася, што ў кніжках не знайсці: трэба капацца ў архівах. Адзін гісторык даў мне кантакт хлопца, які таксама цікавіўся гісторыяй Рагачова. У гэтага хлопца ёсць шмат здымкаў горада мінулых часоў. Я хачу на падставе гэтых здымкаў зрабіць паштоўкі. На жаль, у маленькіх гарадах людзі не заўсёды разумеюць, што ёсць нешта каштоўнае ў месцы, дзе яны жывуць. У рагачоўцаў таксама няма яскравай патрыятычнай рыскі, як, напрыклад, у майго сябра з Навагрудка, які быццам народжаны з пачуццём любові да свайго горада. У жыхароў Навагрудка ёсць Міцкевіч, у жыхароў Віцебска — Шагал, а ў нас хаця б той жа Караткевіч. Хай нарадзіўся ён у Оршы, жыццё яго вельмі моцна звязана з Рагачовам. Але людзі ў нас не падрыхтаваныя да ўсведамлення сваёй культурнай спадчыны. Спадзяюся, гэта калі-небудзь зменіцца. Я ж буду старацца гэтаму паспрыяць.

Гутарыла Тамара САРАЧЫНСКАЯ.